**“Научно-техническая обработка комплекса архивных документов Н.Б. Ватацы” (2008 г.)**

У 2008 г. адзначалася 100-годдзе з дня нараджэння заслужанага работніка культуры Беларусі, члена Саюза пісьменнікаў Рэспублікі Беларусь, былога супрацоўніка Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі Ніны Барысаўны Ватацы (1908–1997). У Нацыянальнай бібліятэцы Беларусі існуе фонд асабістага паходжання, які адлюстроўвае жыццё гэтай выдатнай асобы. Ён паступіў на захаванне ў 2000 г. і зберагаецца ў навукова-даследчым аддзеле кнігазнаўства. Гэта рукапісныя матэрыялы (артыкулы ў газетах і часопісах, прадмовы да энцыклапедый), перапіска з выбітнымі дзеячамі беларускай культуры, біяграфічныя дакументы (узнагародныя лісты, пасведчанні на медалі, членскія білеты грамадскіх арганізацый, даведкі аб адукацыі і працоўным шляху), фотаздымкі. У 2008 г. праводзілася навукова-тэхнічная апрацоўка комплексу архіўных дакументаў Н.Б. Ватацы: была выканана сістэматызацыя матэрыялаў па асноўных групах дакументаў (сфарміравана каля 300 адз. зах.), складзены іх вопіс, фонд падрыхтаваны да інвентарызацыі і заінвентарызаваны. Паралельна праводзілася навуковае даследаванне фонду, вынікі якога адлюстраваны ў артыкулах і паведамленнях на канферэнцыях. У музеі кнігі дэманстравалася выстава да 100-годдзя з дня нараджэння Н.Б. Ватацы, на якой экспанаваліся найбольш цікавыя і каштоўныя матэрыялы з архіўнага комплексу.